7. Советско-болгарские отношения и связи. Сент. 1944 – дек. 1958. М.: Наука. 1981.
8. Внешняя политика Советского Союза в период Отечественной войны. Документы и материалы. 1 января – 3 сентября 1945 г. М.: Госполитиздат, 1947.
9. Косик В. И. Балканы: «Порвалась цепь великая…. » (середина XIX – начало XXI вв.). М.: ИС РАН, 2014.
10. Василевский А. М. Дело всей жизни. Кн. 2. М.: Политиздат, 1973.
11. Великая Отечественная война, 1941–1945. М.: ОЛМА-ПРЕСС: Образование, 2005.
12. Гареев М. А. Полководцы Победы и их военное наследие. 2-е изд., испр. и доп. М.: Инсан, 2004.
13. Маршалы / авторы-сост. И. Н. Кулан, Ю. П. Сеньков. Минск: Кнігазбор, 2011.
14. Кузнецов П. Г. Маршал Толбухин. М.: Воениздат, 1966.

# КАНСТЫТУЦЫЯ БССР 1978 ГОДА ЯК КРЫНІЦА ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ СТВАРЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ГРАМАДСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ НОРМ

***А. Л. Дашкевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь;*
*Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі*
*«Міжнародны ўніверсітэт МІТСО»,*
*вул. Казінца, 21, к. 3, 220099, г. Мінск, Беларусь, aldminsk75@mail.ru*

Канстытуцыя БССР 1978 г. як крыніца прававога рэгулявання стварэння і дзейнасці грамадскіх фарміраванняў ва ўмовах станаўлення суверэнітэту Рэспублікі Беларусь зведала істотную трансфармацыю канстытуцыйных норм, якая была заснавана на пераглядзе асноў грамадскага і дзяржаўнага ўладкавання. Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР абумовіла дуальны характар канстытуцыйнага рэгулявання, з улікам захавання дзеяння Канстытуцыі БССР 1978 г., што атрымала сваё ўвасабленне ў нарматворчай дзейнасці, у тым ліку, праз змены і дапаўненні тэксту Канстытуцыі, наданне нормам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР больш высокай юрыдычнай сілы, прыняцце новых нарматыўных прававых актаў.

***Ключавыя словы:*** канстытуцыя; трансфармацыя канстытуцыйных норм; грамадскія фарміраванні.

# КОНСТИТУЦИЯ БССР 1978 ГОДА КАК ИСТОЧНИК ПРАВОВОГО РЕГУЛИРОВАНИЯ СОЗДАНИЯ И ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОБЩЕСТВЕННЫХ ФОРМИРОВАНИЙ: ТРАНСФОРМАЦИЯ КОНСТИТУЦИОННЫХ НОРМ

***А. Л. Дашкевич***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь;*
*Учреждение образования Федерации профсоюзов Беларуси*
*«Международный университет МИТСО»,*
*ул. Казинца, 21, к. 3, 220099, г. Минск, Беларусь, aldminsk75@mail.ru*

Конституция БССР 1978 г. как источник правового регулирования создания и деятельности общественных формирований в условиях становления суверенитета Республики Беларусь претерпела существенную трансформацию конституционных норм, которая была основана на пересмотре основ общественного и государственного устройства. Принятие Декларации о государственном суверенитете БССР обусловило дуальный характер конституционного регулирования, с учетом соблюдения действия Конституции БССР 1978 г., что получило свое воплощение в нормотворческой деятельности, в том числе, через изменения и дополнения текста Конституции, придание нормам Декларации о государственном суверенитете БССР более высокой юридической силы, принятие новых нормативных правовых актов.

***Ключевые слова:*** конституция; трансформация конституционных норм; общественные формирования.

## THE CONSTITUTION OF THE BSSR OF 1978 AS A SOURCE OF LEGAL REGULATION OF CREATION AND ACTIVITY PUBLIC FORMATIONS: TRANSFORMATION OF CONSTITUTIONAL NORMS

***A. L. Dashkevich***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus;*
*Educational institution of the Federation of Trade Unions of Belarus «International University MITSO»*
*vul. Kazinca, 21, k. 3, 220099, Minsk, Republic of Belarus aldminsk75@mail.ru*

The Constitution of the BSSR of 1978 as a source of legal regulation of the creation and activity of public formations in the conditions of the formation of the sovereignty of the Republic of Belarus underwent a significant transformation of constitutional norms, which was based on the revision of the foundations of social and state structure. The adoption of the Declaration on State Sovereignty of the BSSR conditioned the dual nature of constitutional regulation, taking into account the observance of the Constitution of the BSSR of 1978, which was embodied in rule-making activities, including through amendments and additions to the text of the Constitution, giving the norms of the declaration on state sovereignty of the BSSR a higher legal force, the adoption of new normative legal acts.

***Keywords:*** Constitution; transformation of constitutional norms; social formations.

Станаўленне суверэнітэта Рэспублікі Беларусь ажыццяўлялася ва ўмовах трансфармацыі канстытуцыйных норм у перыяд дзеяння Канстытуцыі БССР 1978 г., што адлюстроўвала «дэмантаж» савецкай прававой сістэмы, як па «вертыкалі», так і па «гарызанталі» у межах спалучэння саюзнага і рэспубліканскага ўзроўняў заканадаўства. Праз крызіс існаваўшай канстытуцыйнай сістэмы адзін парадак змяняўся іншым.

Канстытуцыя БССР 1978 г. была ўведзена ў дзеянне згодна з Дэкларацыяй «Аб прыняцці і абʼяўленні Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» ад 14 красавіка 1978 г. [1, с. 12]. Яна прымянялася, згодна з арт. 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб

парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь» [2], да ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г. (апошняя змянялася і дапаўнялася ў 1996, 2004, 2021, 2022 гг.).

Пераўтварэнне канстытуцыйных норм можа адбывацца, па-першае, праз фармальна-юрыдычныя змены канстытуцыі, або яе частковы перагляд. Гэта ажыццяўляецца ў адпаведнасці з устаноўленым самой Канстытуцыяй парадку і ўяўляе сабой яе тэкставае пераўтварэнне, якое змяняе (істотна ці нязначна) «літару» і «дух» (сэнс) Асноўнага Закона. Па- другое, магчыма фактычнае змяненне Канстытуцыі, што азначае нетэкстуальнае змяненне аб'ёму яе нарматыўнага зместу, не прадугледжаную Асноўным Законам карэкцыю канстытуцыйных сэнсаў [3, с. 42].

Пераўтварэнне норм Канстытуцыі БССР, рэгулюючых стварэнне і дзейнасць грамадскіх фарміраванняў, з улікам спецыфікі існаваўшага ў межах канстытуцыйнага заканадаўства катэгарыяльна-паняційнага апарата ў гэтай сферы, ажыццяўлялася, як у межах тэкстуальнай праўкі, так і выкарыстоўваючы розныя формы яе фактычнага змянення.

У гэтым кантэксце звернем увагу на прававыя акты асаблівай формы, як іх вызначае прафесар Г. А. Васілевіч [4]. У прыватнасці, да ліку такіх актаў аднесена Дэкларацыя Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» ад 27 ліпеня 1990 г. (далей – Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце) [5], Закон Беларускай ССР «Аб прыданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» ад 25 жніўня 1991 г. (далей – закон аб прыданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі) [6].

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце з моманту свайго прыняцця мела не толькі характар важнай палітычнай заявы, але і валодала несумненным юрыдычным значэннем. Па крытэрыях афіцыйнасці, дакументальнасці, кампетэнтнасці і захавання належнай працэдуры прыняцця, яна цалкам адпавядала крытэрыям уласцівым нарматыўна-прававому акту. Выказваецца меркаванне, што дэкларацыя была законам канстытуцыйнага зместу і значэння з самага пачатку, юрыдычная сіла якога прыраўноўвалася да такой, якая была ў Асноўнага Закона. Выкарыстаная Вярхоўным Саветам форма дэкларацыі была адэкватна задачы заканадаўчага замацавання гістарычна новых устаноўчых норм (норм – пачаткаў, норм – прынцыпаў). Яна адлюстроўвала той факт, што форма

канстытуцыйнага закону тады яшчэ не была знаёма заканадаўцу [7, с. 121–122].

У дачыненні грамадскіх фарміраванняў адзначым замацаванне ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце палажэння аб праследванні па закону любых гвалтоўных дзеянняў супраць нацыянальнай дзяржаўнасці БССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб (ч. 4 арт. 1). Тым самым ускосна прадугледжвалася існаванне шматпартыйнасці, укараненне паняцця грамадскага аб’яднання замест выкарыстоўваемага ў Канстытуцыі БССР 1978 г. паняцця грамадскай арганізацыі.

Таму прыняцце 28 ліпеня 1990 г. Закона Беларускай ССР «Аб зменах і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР» [8], якія прадугледжваў радыкальныя змены зместу шэрагу артыкулаў Канстытуцыі БССР 1978 г., былі не толькі працягам змен, унесеных у Канстытуцыю СССР раней, але непасрэдна суадносіліся са зместам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Так, у арт. 6 зменenай Канстытуцыі замацоўвалася, што палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, масавыя рухі могуць прымаць удзел у выпрацоўцы палітычнага курсу БССР, яе сацыяльна-эканамічным, духоўным развіцці, кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі. Свабода дзейнасці партый, грамадскіх арганізацый, масавых рухаў па выкананні задач і функцый, прадугледжаных іх статутамі і праграмамі, абмяжоўвалася неабходнасцю кіравацца палажэннямі канстытуцый і законаў СССР і БССР. Забаранялася стварэнне і дзейнасць партый, грамадскіх арганізацый, масавых рухаў, мэтай якіх з’яўлялася гвалтоўнае змяненне савецкага канстытуцыйнага ладу, якія выступалі супраць цэласнасці і бяспекі рэспублікі, канстытуцыйных правоў і свабод яе грамадзян (арт. 7). У арт. 49 прадугледжвалася, што грамадзяне БССР маюць права аб’ядноўвацца ў палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, удзельнічаць у масавых рухах.

Адначасова з адзначаным законам Вярхоўны Савет прыняў пастанову «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў у Беларускай ССР» [9], якая фармальна абапіраючыся на зменены 6, 7, 49 артыкулы Канстытуцыі, выкарыстала паняцце грамадскага аб’яднання. Гэтае паняцце было ўключана ў тэкт Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, а потым атрымала сваё замацаванне ў Часовым палажэнні аб парадку стварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў грамадзян у Беларускай ССР, зацверджанага пастановай Савета Міністраў 3 кастрычніка 1990 г. [10]. Гэта суадносілася з саюзнай практыкай нарматворчай дзейнасці ў межах

прыняцця Закона СССР «Аб грамадскіх аб’яднаннях» 9 кастрычніка 1990 г., якія уступіў у сілу толькі 1 студзеня 1991 г. [11].

Аб дуалістычным характары канстытуцыйнага рэгулявання адносна стварэння і дзейнасці грамадскіх фарміраванняў у гэты час сведчыць, у тым ліку, прэамбула Закона Беларускай ССР «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Беларускай ССР» [12], дзе непасрэдна ўказвалася, што Вярхоўны Савет пры яго прыняцці кіруецца Канстытуцыяй (Асноўным Законам) Беларускай ССР і Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце.

Адпаведна Закон аб прыданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі толькі ліквідаваў юрыдычную «недаказанасць» Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, уводзячы ў канстытуцыйна права нашай рэспублікі паняцце «канстытуцыйны закон» і канстатуючы, што яна з’яўляецца часткай некадыфікаванай па форме канстытуцыі, нават той яе часткай, якая мае прыярытэт над пакуль яшчэ дзеючай кадыфікаванай яе часткай – Канстытуцыяй БССР 1978 г. [7, с. 122], што непасрэдна ўлічвалася заканадаўцам, у тым ліку, у дачыненні грамадскіх фарміраванняў.

Такім чынам, ва ўмовах станаўлення суверэнітэту Рэспублікі Беларусь ажыццяўлялася трансфармацыя канстытуцыйных норм у дачыненні грамадскіх фарміраванняў. Яна была заснавана на пераглядзе асноў грамадскага і дзяржаўнага ўладкавання, замацаваных у Канстытуцыі БССР 1978 г. Канстытуцыя БССР 1978 г. як крыніца прававога рэгулявання стварэння і дзейнасці грамадскіх фарміраванняў дзейнічала ва ўмовах прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Апошняя вызначала новыя ўстаноўчыя канстытуцыйна-прававыя пачаткі, у тым ліку, у дачыненні грамадскіх фарміраванняў, вызначаючы дуальны характар канстытуцыйнага рэгулявання. Гэта атрымлівала сваё ўвасабленне ў нарматварчой дзейнасці, як праз змены і дапаўненні тэксту Канстытуцыі, надання нормам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР больш высокай юрыдычнай сілы, так і шляхам прыняцця нарматыўных прававых актаў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Василевич Г. А. Законодательное определение источников права как важнейшее средство разрешения коллизий (белорусский опыт) // Вестник Нижегородской академии МВД России. 2017. № 2 (38). С. 9–18.
2. О порядке вступления в силу Конституции Республики Беларусь [Электронный ресурс]: Закон Респ. Беларусь от 15 марта 1994 г. № 2876-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.

3. Червонюк В. И. Феномен фактического изменения Конституции (коннотации эволюционирующей, «живой Конституции») // Вестник экономической безопасности. 2019. № 2. С. 41–46.
4. Василевич Г. А. Правовые акты особой формы: их место и роль в развитии национальной правовой системы [Электронный ресурс] // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
5. О государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики [Электронный ресурс]: Декларация Верховного Совета Белорусской Советской Социалистической Республики, 27 июля 1990 г., № 193-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
6. О придании статуса конституционного закона Декларации Верховного Совета Белорусской Советской Социалистической Республики о государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики [Электронный ресурс]: Закон Белорусской ССР, 25 августа 1991 г., №1017-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
7. Немкевич И. В. К вопросу о юридической природе «Декларации о государственном суверенитете БССР» // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. 2021. №2. С. 118–122.
8. Об изменениях и дополнениях Конституции (Основного Закона) Белорусской ССР [Электронный ресурс]: Закон Белорусской ССР, 28 июля 1990 г., №212 – XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
9. О регистрации общественных объединений в Белорусской ССР [Электронный ресурс]: постановление Верховного Совета Белорусской ССР, 28 июля 1990 г., №222 - XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
10. Об утверждении «Временного положения о порядке образования и деятельности общественных объединений граждан в Белорусской ССР» [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров БССР, 3 окт. 1990 г., №255 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.
11. Об общественных объединениях: Закон СССР, 9 октября 1990 г., №1708-1 // Ведомости СНД и ВС СССР. 1990. №42. Ст. 839.
12. Об основных принципах народовластия в БССР [Электронный ресурс]: Закон БССР, 27 февраля 1991 г., №651-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2022.

# ПРОИСХОЖДЕНИЕ СЕЙМА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В НАУЧНОЙ ДИСКУССИИ М. К. ЛЮБАВСКОГО И Н. А. МАКСИМЕЙКО

***К. Д. Довматович***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости 4, 220030, г. Минск, Беларусь, kirill28.02@mail.ru*

Цель статьи – рассмотрение истриографических подходов к проблеме прохождения сейма Великого Княжества Литовского через призму столкновения